несур'ё зна пра сур'ёзнае

Андрэй Сідарэйка



# Жонка на гадзіну

# Андрэй Сідарэйка
# Жонка на гадзіну
## Серия «Несур’ёзна пра сур’ёзнае»

*Текст предоставлен правообладателем*
*http://www.litres.ru/pages/biblio_book/?art=40902419*
*Андрэй Сідарэйка. Жонка на гадзіну: Четыре четверти; Минск; 2019*
*ISBN 978-985-581-139-9*

## Аннотация

У кнізе сабраны гумарыстычныя творы, якімі апошнія гады радаваў Андрэй Сідарэйка чытачоў часопіса сатыры і гумару «Вожык», выданняў «Літаратура і мастацтва», «Звязда», «Настаўніцкая газета». Гумарэскі, іранескі, п’есы, фельетоны не толькі могуць палепшыць настрой, але і адлюстроўваюць негатыўныя з’явы ў грамадстве.

Хто быў студэнтам, узгадае, як нялёгка прыгатаваць вячэру без страт, вясковы жыхар даведаецца, колькі карова можа даваць малака, мужчыны знойдуць адказ, якія кветкі лепш за ўсё дарыць. І шмат іншых цікавых і неверагодных гісторый чакаюць чытачоў кнігі.

# Содержание


Гісторыйкі 7
Сідарава каза 7
Была ў мяне карова 7
Ці ёсць зялёныя чалавечкі? 9
Сідарава каза, ці Як усё было на самай справе 13
Падарунак ад сэрца 16
Цюльпаны, ружы і мімозы 16
Жонка на гадзіну 21
Нататкі халасцяка 24
Як Вінцук «хваробы» пазбавіўся 27
Не з той нагі 30
Графін 30
Не з той нагі 32
Шчаслівы дзень 35
Конец ознакомительного фрагмента. 37

# Андрэй Сідарэйка
# Жонка на гадзіну
# Гісторыйкі з розных сфер на вясёлы манер

© Сідарэйка А. П., 2019
© ТДА «Выдавецтва “Чатыры чвэрці”», 2019

# Андрэй Сідарэйка



З гумарам аўтар пасябраваў даўно. Першую гумарэску напісаў падчас вучобы на факультэце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. З ёю дэбютаваў у рэспубліканскім часопісе сатыры і гумару «Вожык» яшчэ ў 2009 годзе.

З таго часу ў творчым багажы пісьменніка з’явілася шмат вясёлых твораў. Іх жанравая палітра разнастайная. Гэта гумарэскі, іранескі, былі, фельетоны, міні-п’есы.

З чаго ў гумарыстычных творах смяецца аўтар? З чалавечых хібаў і заганаў, лайдакоў. Адлюстроўвае адвечныя ўзаемаадносіны мужчын і жанчын, выкрывае негатыўныя з’явы паўсядзённага жыцця, распавядае цікавыя студэнцкія і навагоднія гісторыі.

Калі казаць пра сур’ёзнае, то Андрэй Сідарэйка выступае і з апавяданнямі ў рэспубліканскіх выданнях краіны. Двойчы станавіўся лаўрэатам конкурсу апавяданняў Выдавецкага дома «Звязда».

Аўтар зычыць усім быць вясёлымі і шчаслівымі!

# Гісторыйкі

## Сідарава каза
## Вясковыя гісторыйкі

### Была ў мяне карова

Чалавек я вясковы. Люблю жыўнасць, прыроду. І карова ў мяне была. Зойкай звалі. Думаеце, мужчыны кароў не трымаюць? Трымаюць. Але калі ўжо распавядаць, то ўсё па парадку.

Прыходжу я на кірмаш. Бачу, чалавек карову прадае. Я – да яго.

– Колькі малака дае? – пытаюся.

А ён – мне:

– Ды тры разы па вядры.

Прызнацца, я, дурань, не ўдакладніў, менавіта чаго дае: малака, кефіра, смятаны альбо чаго іншага. Толькі падумаў: «Ого! Ну, два вядры, гэта я разумею. Гэта ва ўсіх так. Але каб тры!»

– А якое ж вядро? – распытваю ў чалавека далей.

– Ды вось пятнаццацілітровае заўсёды з сабою браў, дык

амаль па поўным і давала, – адказвае ён.

– А ці не падманваеце?

– Навошта мне маніць? Купіце – і паглядзіце самі.

– А каштуе ваша кароўка колькі?

– Нядорага. Дапамагу яшчэ і дамоў завесці.

«Ат, – думаю, – грошы невялікія, вазьму, калі так». Заплаціў я за карову ды і пайшоў з ёй з кірмашу.

Прывёў дадому, травы, вады, буракоў даў. Ну і, канечне, вядро патрэбнае знайшоў. Пятнаццацілітровае. Сяджу, чакаю, калі час Зойку даіць надыдзе. Пачакаў, пачакаў ды і шмыгануў у хлеў.

Пачаў даіць. Малако струменьчыкам у вядро – цвыркцвырк. А Зойка мая стаіць спакойна, не варухнецца, толькі з ноздраў пар пускае і ўсё жвачку сваю жуе. А я даю. Вось ужо і дзесяцілітровая мяжа перасягнута, а я ўсё – цвырк-цвырк. Надаіў амаль поўнае вядро, як тут маю Зойку нібы авадзень укусіў. Страпянулася ўся ды нагой па вядры – бух! Усё малако і разлілося. Толькі літр які на дне застаўся.

Што рабіць? Я зноў даў ёй травы, вады... Рацыён, што сказаць. Без яго нікуды. А калі прыйшла часіна даіць – скок у хлеў.

Пачаў даіць. Малако ў вядро ўжо аж раўчуком – плюхплюх. А Зойка стаіць сабе спакойна ды жвачку жуе. Вось і восем літраў нацякло неўпрыкмет. Ну, думаю, зараз не падманеш мяне, Зоя. Не стану я цябе ўсю выдойваць. Яшчэ дзве кроплі – і хопіць. Толькі я так падумаў, як маёй Зойцы нібы

хто перцу ў ноздры сыпануў. Галавой матнула ды па вядры нагой як бухне! Усё малако і разлілося. Мо з паўлітра ў вядры і засталося.

Што ж гэта за ліха такое!.. Я зноў ёй тое ж самае: вады, травы, буракоў. А сам сяджу з вядром на канапе і ўсё на гадзіннік паглядваю, калі прызначаная часіна настане. А як настала – хутчэй у хлеў.

Пачаў даіць. Малако ў вядро ўжо ледзьве не само цячэ. А Зойка стаіць, не зварухнецца. Хвіліна – і паўвядра малака. Ну, думаю, хопіць. Мы не скупыя, нам і столькі добра. Толькі так падумаў, як маёй Зойцы нібы хто табакі даў нюхнуць. Чмыхнула яна ды нагой па вядры як бухне! І кроплі лізнуць не засталося, не тое што літра.

Палічыў я – і сапраўды: тры разы па вядры атрымоўваецца. Не схлусіў чалавек. Праўду сказаў.

Пахадзіў затым некалькі дзён у хлеў, ды марна – малака як кот наплакаў.

Раззлаваўся я тады ды так Зойцы і сказаў:

– Штосьці я цябе, Зоя, не разумею. Даеш літр малака, а гною ўжо цэлы воз.

Узяў ды павёў яе на кірмаш.

Эх, была ў мяне карова. Цяпер каровы няма…

## Ці ёсць зялёныя чалавечкі?

– А распавядзі, Адась, як вы з Ігнатам на рыбалку мінулым

летам хадзілі, – папрасіў Патап.

Некалькі мужчын сядзелі познім летнім вечарам на лавачцы каля хаты.

– Дык я ж апавядаў, і не раз, – адмахнуўся той. – Гэтая гісторыя даўно быллём парасла.

– Усё адно, цікава было б паслухаць зноў, – падтрымаў просьбу таварыша Саўка.

– Ну, так і быць, распавяду. Пайшлі мы тады на рачулку, што каля Дзям'янава лесу. Закінулі вуды, чакаем. А каб рыбачыць было весялей, прыхапілі з сабой бутэльку. Сядзім, адпачываем… Праўда, не бярэцца рыбка.

– Што, так нічога і не злавілі? – пацікавіўся Рыгор.

– Ты лепш слухай, не перабівай, – незадаволена буркнуў Адась. – На кручку – пуста, у бутэльцы – апошняя кропля. Тут Ігнат і прапанаваў: «А давай у лес сходзім. Карасёў не налавілі, дык хоць грыбоў назбіраем». І сапраўды: гадзіну пахадзілі – амаль па вядры белых. Ужо дадому зазбіраліся, ды па дарозе набрылі на паляну. Глядзім – нейкая талерка вялізная стаіць. НЛА, ні даць ні ўзяць! У нас душа ў пяткі, валасы дыбам…

– Ты нас на мякіне не ашукаеш, – недаверліва адазваўся Апанас.

– Калі не хочаш – не слухай, а іншым не перашкаджай. Дык вось, з яе выйшлі тры дзіўныя зялёныя чалавечкі і накіраваліся да нас. Давай да сябе ў госці клікаць. У гэты аб'ект, значыць.

– Што, так па-нашаму і запрасілі? – не паверыў Патап.

– Цяжка растлумачыць, на якой мове, – адказаў Адась. – Быццам і не на нашай, а ўсё зразумела. Так шчыра прасілі, што мы не ўтрывалі, пайшлі.

– І як там? – пацікавіўся Саўка.

– Прыгожа ўсё. Як у старшыні ў кабінеце. Частаваць нас пачалі, стравы ўсе – заморскія. Ніколі ў жыцці такіх не бачыў.

– Дык адкуль яны прыляцелі? – перабіў апавядальніка Рыгор. – З Месяца ці з Марса?

– А я, думаеш, ведаю? – абурыўся Адась. – Калі было цікавіцца. Не думалі мы пра гэта.

– Можа, і гарэлка ў іх была свая? – запытаўся Апанас.

– Але, нейкую вадкасць дасталі. Таксама зялёную. Пілі мы яе, пілі, а яна ўсё не заканчвалася…

– Вось бы так і самагонка ніколі не пераводзілася, – выдыхнуў Саўка.

– Колькі мы там прабылі – не ведаем, – працягваў апавядальнік. – Скончылася тым, што яны прапанавалі: «А паляцелі з намі! Што вам тут рабіць?» Мы, вядома, спужаліся. Думаем, хопіць гасцяваць. Нам ісці, маўляў, патрэбна. Жонкі, дзеці чакаюць.

– А яны? – акругліў вочы Саўка.

– Што яны? І слухаць не хочуць. Кажуць, будзем там у іх важнымі персонамі. Ну, як аграном наш, не менш. Розных зямлян бачылі, але такіх, як мы, – упершыню.

– Ага, выдумляй, – усміхнуўся Рыгор. – І чым жа вы ім гэтак спадабаліся?

– Мы і самі не паверылі. Кажам, пайшлі з намі ў вёску, там такіх шмат. А яны: «Не. Нам патрэбны вы. Рэдкія экзэмпляры!» Маўляў, адказныя вельмі. Цэлы дзень на паплавок глядзелі, з месца не сыходзілі. Мы не разгубіліся: «А куды ж пойдзеш? Дома – агарод, дровы, а тут – прырода, раздолле…»

– А яны? – Саўку, відаць, вельмі захапіла гісторыя Адася.

– Не верaць нам. Прасілі іх, прасілі – ніяк. Думалі, давядзецца ляцець. Але тут заўважылі невялікі выхад ды як далі драпака! Адкуль толькі хапіла духу? Выбеглі з лесу – і ўсё. Як адрэзала. Што далей было, не памятаем.

– Як гэта? – здзівіўся Патап.

– А так. Апрытомнелі толькі наступнай раніцай каля рачулкі. Туды жонкі нашы прыйшлі, разбудзілі.

– Ха-ха-ха, – засмяўся Рыгор. – Дык гэта вам усё прыснілася!

– Хіба дваім магло прысніцца? – не пагадзіўся Адась.

– Вось я гэты аповед слухаю не першы раз, а цікава, – заначыў Саўка.

– Слухай, Адась, а чаму вы з Ігнатам усё ж пабаяліся ляцець з прышэльцамі?

– Што б я там рабіў? Ды без Марыліных дранікаў з салам і яешняй.

Адась усміхнуўся і паглядзеў на неба. На ім з’явіліся зоркі

і месяц.

– А так, канечне, хадзілі б зараз з Ігнатам вунь там і назіралі за вамі звысоку. Але на Зямлі весялей.

– Вось заўтра ў Ігната запытаем, як было на самай справе, – пажартаваў Саўка.

– Калі ласка, – пагадзіўся Адась.

І так сябрам захацелася даведацца, ці існуюць зялёныя чалавечкі, што назаўтра яны ўсёй кампаніяй адправіліся на рыбалку. Ці сустрэлі іншапланецян – невядома. Вядома толькі, што добра бавілі час, бо наступнай раніцай на беразе іх пабудзілі жонкі…

## Сідарава каза, ці Як усё было на самай справе

Мяне завуць Сідар. Вы, напэўна, лічыце, што я жорсткі і сварлівы чалавек? Канечне ж, адлупцаваў казу. Але яна сама вінаватая ў гэтым, бо парушыла нашу дамову. А пачалося ўсё так…

Аднойчы жонка кажа мне:

– Давай, купі казу. Казінае малако надта карыснае, імунітэт умацоўвае.

Я з жонкаю спрачацца не прывык. Таму назаўтра пайшоў на кірмаш і купіў казу.

Завёў яе на луг, прывязаў да дрэва. Праз гадзіну прыходжу – няма казы. Прыгледзеўся, а яна ў суседскім агародзе буракі

прарэджвае ды на маладую капусту налягае. Выгнаў адтуль, зноў да дрэва прывязаў і дадому падыбаў.

Але неўзабаве не вытрымаў і зноў пабег на луг. А каза ўжо іншаму суседу агарод «палоць» дапамагае.

Я папярэдзіў рагатую:

– Будзеш карміцца чужымі агародамі, плаціць будзеш сваімі бакамі.

І дубец паказаў. Яна патрэсла барадой, маўляў, згодная.

Так і мінуў дзень.

Увечары жонка падаіла казу, паспытала малака ды кажа:

– Смачнае. Адразу адчула, як імунітэт умацоўваецца.

– Вядома, – адказваю, – гэта ж напой з суседскай капусты ды буракоў.

Чаму яму не быць смачным і карысным?

І сам ледзь не літр выпіў. Здалося, нават паздаравеў.

На наступны дзень я казу не прывязваў. Думаю, калі ў агарод чый завітае, то і добра, вітамінаў у малацэ больш будзе.

Так і пачалі жыць. Каза па чужых агародах ходзіць, а мы са старой імунітэт умацоўваем.

Аднойчы рагатая ў наш агарод завітала, гародніну нібы языком злізала. Як убачылі мы з жонкай такое, дык аж ціск падскочыў. Я адразу пабег дубец шукаць. Вярнуўся, а на двары старшыня сельсавета стаіць і суседзі сабраліся. Талкуюць: маўляў, ёсць сведкі, ваша скаціна нашыя агароды спляжыла, аплаціце ўрон пацярпелым. Што зробіш? Аддаў грошы.

Вечарам зайшоў у хлеў і кажу казе: «Я цябе папярэдж-

ваў, калі будзеш карміцца чужымі агародамі, плаціць будзеш сваімі бакамі? Ты не паслухала. Вось і атрымлівай». Лупцаваў яе не таму, што грошы суседзям давялося заплаціць, а таму, што каза на свой агарод вока кінула.

На наступны дзень завёў яе на кірмаш.

З таго часу я з козамі не сябрую і ні пра што не дамаўляюся. Слова яны не трымаюць. А што тычыцца імунітэту, то цяпер мы з жонкай павышаем яго гарбузовымі семкамі. Вітамінаў у іх – не пералічыць.

P. S. *Узяць каментар у казы аўтару не атрымалася. Ніхто не ведае, дзе яна знаходзіцца. Ды наўрад ці мы пачулі б ад яе праўду. А ці верыць Сідару, вырашайце самі.*

# Падарунак ад сэрца
# Сямейныя гісторыйкі

## Цюльпаны, ружы і мімозы

Іх супакоілі. Прадаўшчыцу і Мішку.

Мішка, якога выводзілі з крамы Воўка і Колька, усё ж сказаў на развітанне некалькі слоў. Маўляў, няякасны напітак рэалізуюць, дзяруць немалыя грошы, а пасля сцвярджаюць, што людзей губіць вада.

– А я тут прычым? – апраўдвалася прадаўшчыца. – Якое прывозяць, такое і рэалізуем.

Прадаўшчыца была мілавіднай, сярэдніх гадоў жанчына.

– На Вас зірнуць, то Вы нічога, а людзей дык дурыце, – сказаў у дзвярах Мішка.

– Усе вы так, мужчыны, кажаце, – паляцела наўздагон сумнае, жаночае. – А самі зіркаеце не на прыстойную і прывабную, а на прылавак.

На вуліцы да нас падскочыў Сашка. Утварылася кампанія. Была нядзеля, таму ніхто не спяшаўся. Мішка выцягнуў з кішэні штаноў «зялёны» грошык і пакруціў яго ў паветры перад нашымі насамі. Мы былі не супраць. Дастаўшы з кішэняў купюры рознай вартасці, прадэманстравалі перад Мішкам яго ж трук.

Адным словам, скінуліся.

Мішка з урачыстасцю зазначыў:

– Айчынную вытворчасць патрэбна падтрымліваць: добрую і розную.

Што ж, купілі таматны сок.

Ужо за прылаўкам, распіваючы другую шклянку цягучай вадкасці, Мішка стаў гаварыць шчыра:

– Бач ты, як у жыцці атрымоўваецца, – пачаў ён здалёк, – да 23 лютага штодзень у каляндар часцей заглядвала Маша, а пасля я.

– Пэўна, «сямейны» каляндар вам прыйшоўся даспадобы, – разважыў Колька.

– Яшчэ б, – у тон адказаў Мішка, – асабліва, калі бачыш перад носам даты такіх грандыёзных маштабаў.

Сашка строга зазначыў:

– А дзе факты?!

Мішка факт выдаў:

– 8 сакавіка ўжо заўтра!

– Хіба?!

Мішка кіўнуў.

Мы дружна пачасалі патыліцы. У адрозненні ад Мішкі, з нас ніхто не меў звычкі заглядваць ў каляндар ні напярэдадні свята, ні пасля яго. Бо жылі адным днём.

– Падарунак ужо выбраў? – пацікавіўся Воўка.

– У тым і справа, што не, – разгублена вымавіў Мішка. – А горш за ўсё тое, што я і не ведаю, што выбраць…

Сашка здзівіўся.

– Як? Зусім няма ніякай думкі?

Чатыры пары вачэй утаропіліся ў Мішку.

– На Новы год скончыліся ўсе, – з сумам кантаставаў той. – Яшчэ напярэдадні нашага першага сямейнага свята я запытаўся ў Машы: «Что тебе подарить, человек мой дорогой?» Яна ж на здзіўленне адказала: «Кветкі». На той час я хадзіў у неадпрасаваных штанах, таму падарыў ёй прас «Алеся». Наступны раз я таксама пачуў знаёмы адказ: «Кветкі». Падарыў Машы патэльню «Tefal». Маўляў, сама, каханенькая бачыш, што я заўсёды клапачуся і думаю толькі пра цябе. І яшчэ шмат якіх добрых рэчаў па парадах рэкламы падарыў я Машы. А на гэты Новы год яна мне кажа: «Ведаеш, любы, для поўнага сямейнага шчасця нам не хапае толькі кухоннага камбайна. Але я не хвалююся, бо ведаю, што знайду яго пад ёлкай у навагоднюю ноч».

– Як у ваду глядзела, – расчаравана ўздыхнуў Мішка. Мабыць, на гэты раз усё ж падару ёй кветкі. Ніколі не здагадаецца!

І Мішка паставіў на прылавак пустую шклянку.

– Тут ёсць паблізу некалькі кропак, – пачаў прыпамінаць Сашка, – дзе гандлююць кветкамі.

…Праз пяць хвілін мы стаялі каля трох кветкавых крам, якія мелі адну і тую ж назву «Кактус».

Мішка абурыўся:

– Хіба тут знойдзеш ружы?

– Можа, за калючкамі кактусаў разгледзім і ружы, – знайшоўся Воўка.

У першай краме вочы ад кветак разбягаліся ва ўсе бакі, як зайцы ад ваўкоў, але паварухнуцца ў натоўпе не было як. У другой прапанова не задаволіла наш спажывецкі попыт. Толькі ў трэцяй нам пашанцавала.

– Вам што? – запыталася адна з двух маладзенькіх дзяўчат-прадаўцоў.

– Нам…

Мішка разгублена паглядзеў спачатку на нас, а потым на прадаўцоў.

– Якія кветкі вам падабаюцца? – не адступала ад нас другая дзяўчына.

– А нам бы зірнуць…

Нас правялі ў глыб залы, сталі паказваць і адначасова расказваць.

– У першых радах у нас цюльпаны. Вось цюльпан «Галандская прынцэса», вось «White dream», «Парад», «Абба». Далей – ружы. Гэта ружа «Гран-пры», гэта «Foreve young», а гэта «Опіум». Апошні рад – мімозы.

Маладзенькая дзяўчына настойліва запыталася зноў:

– Які ваш выбар?

– А хіт сезона? – знайшліся мы.

– А дарыць вы будзеце ад сэрца, або каб адкруціцца?

Мішка, было відаць, на імгненне задумаўся, але, убачыўшы нашы пільныя позіркі, адразу ж ажывіўся.

– А як жа, – пачаў Мішка, – вядома, ад сэрца.

Хаваючы ўсмешку, адна з прыгажунь сказала:

– Тады вам сюды.

Нам паказалі на дальні кут магазіна. Мы рушылі следам.

– Рамонкі, маргарыткі, нарцысы, ландышы, незабудкі – набор самых модных кветак гэтага сезона.

Мішка здзівіўся.

– Вось гэта?!

Мы паглядзелі на кветкі, а потым на кошт.

– Калі так, то такіх кветак я падару Машы хоць ахапак, – не хаваючы свайго задавальнення, сказаў Мішка. – І ад сэрца, і з задавальненнем, і адкручуся заадно, – раскрыў нарэшце ён свае карты.

…Праз некалькі хвілін кожны з нас выйшаў з магазіна са сваім «хітом сезона».

– А ведаеце, як Пушкін пісаў? – запытаўся Колька.

– Як Пушкін – не, а вось Рубцова чыталі.

І Мішка заспяваў не горш за Аляксандра Барыкіна:

*Я буду долго*
*Гнать велосипед.*
*В глухих лесах его остановлю.*
*Нарву цветов*
*И подарю букет…*

Мішка прыпыніўся.

– А ўсё ж, Сярожа, – сказаў ён мне, – букет рамонак – гэта

не кухонны камбайн. Але ж сэрцу не загадаеш…

Тое, што сказаў мне Мішка, ніхто не пачуў, бо ўсе дружна падтрымалі песню, і таму па бязлюднай вуліцы ляцелі радкі на верш Мікалая Рубцова:

*…Той девушке, которую люблю…*

## Жонка на гадзіну

Аднойчы Антось праглядаў газету і заўважыў на апошняй старонцы аб'яву. Нейкае бюро прапаноўвала патэлефанаваць ім і запрасіць да сябе мужа на гадзіну, які выканае хатнія справы і пазбавіць гаспадыню ад клопатаў.

– Бач ты! – усміхнуўся Антось, закаранелы саракагадовы халасцяк. – Цяпер нават муж на гадзіну ёсць. А жонка?

Ён падышоў да тэлефона, набраў патрэбны нумар: «Зараз пабачым, што такое быць жанатым».

Пачуўся жаночы голас:

– Дзень добры. Вы штосьці хацелі?

– Так, так, – загаварыў Антось. – Я па аб'яве тэлефаную. Тут сказана, што можна заказаць мужа на гадзіну.

– Але.

– Толькі мне муж не патрэбны. Жонку хацеў бы…

На другім канцы дрота ўсё сціхла. А потым усё той жа прыемны галасок адказаў:

– Такіх паслуг мы не прапаноўваем. Але для вас зробім выключэнне.

Дамовіўшыся пра кошт і прызначыўшы час, Антось пачаў чакаць другую палавінку. Думаў, якія хатнія справы задасць «каханай-родненькай», хоць яна мусіла быць такой усяго адну гадзіну.

Нарэшце ў кватэру пазванілі – і Антось пабег да дзвярэй. На парозе стаяла нафарбаваная, модна апранутая маладая жанчына.

– Вы выклікалі жонку на гадзіну?

– Так.

– Ну вось і я, каханенькі! – амаль праспявала жанчына і адразу ж па-гаспадарску пайшла разглядваць кватэру. – Падкажы, калі ласка, колькі мы ўжо жывём у шлюбе?

Антось уключыўся ў гульню.

– А хіба ты не памятаеш, даражэнькая? – пачаў ён гаварыць у такт незнаёмцы. – Гадкоў, мабыць, каля дваццаці.

– Ага. Чаму ж ты тады, дарагі муж, не прыбраў у кватэры? Відаць, увесь гэты час чакаў мяне, седзячы на канапе?

– А як жа! – радасна адгукнуўся Антось. – Вось, думаў, прыйдзе родненькі чалавек, згатуе абед, памые бялізну, прыбярэ…

– Ты што, зусім з глузду з’ехаў? Гэта толькі маладая жонка на такое здольная! А пасля дваццаці гадоў сумеснага жыцця жанчыне, якая выхавала тваіх дзяцей, патрабуецца цішыня. Зразумела?

– Якіх яшчэ дзяцей? – здзівіўся Антось.

– Тых, што ўжо выраслі і недзе гуляюць самі па сабе. Ну, хопіць слоў. Сёння ў мяне добры настрой. Так і быць, памыю табе бялізну і згатую абед. У нас пральная машына ёсць?

– Ёсць, – адказаў Антось.

– Пакладзі ў яе сваю брудную вопратку, насып парашку і націсні на кнопку, – загадала «жонка».

Новаспечаны «муж» усё выканаў.

– Калі машынка спыніцца, не забудзься развесіць адзенне на балконе.

– А што ў нас сёння на абед?

– Паколькі мы з табой на дыеце, то мюслі і зялёная гарбата. Калі гэтага няма, сходзіш у краму і купіш. Так, цяпер твая чарга выконваць сямейныя абавязкі. Памый падлогу, выбі і прапыласось дываны. І не шумі, калі ласка. Не перашкаджай мне размаўляць з сяброўкамі па тэлефоне.

– Што, усе мужчыны так робяць? – удакладніў Антось.

– Пасля дваццаці гадоў сумеснага жыцця – усе. Нават не сумнявайся ў гэтым, каханенькі, – прашчабятала «жонка».

За гадзіну Антось выбіў усе дываны, прапыласосіў іх, памыў падлогу ў кватэры. А яшчэ збегаў у краму і набыў для «палавінкі» мюслі, зялёную гарбату, якую сам ніколі не піў, а сабе купіў пельмені: адзін дзень ён можа абысціся і без дыеты. «Жонка» ж увесь гэты час гутарыла з сяброўкамі па тэлефоне.

Пасля абеду, збіраючыся сыходзіць, яна ўздыхнула:

– Ой, змарылася я ў цябе, каханенькі. Зусім не цэніш ты мяне. Гэта ж трэба, адно і тое ж – прыгатуй, памый, прыбяры… І так дваццаць гадоў! Але нічога не зробіш. Калі будзе жаданне, тэлефануй яшчэ: на трыццацігоддзе сумеснага жыцця, напрыклад. Бывай!

Нягледзячы на тое, што Антось замарыўся, як ніколі, у душы ён быў шчаслівы.

– Усе знаёмыя даўно жывуць з жонкамі. Мне ж пашанцавала: пабыў мужам толькі адну гадзіну!

Больш такой паслугай Антось не карыстаўся.

# Нататкі халасцяка

*Мне абрыдла весяліцца,*
*Мне абрыдла піць-курыць,*
*І таму рашыў жаніцца,*
*Бо хачу сям’ю стварыць.*

***З песні***

*Жанчына пазнаёміцца з мужчынам для стварэння сям’і.*

***З аб’явы***

Раней казалі, што ажаніцца і ў гультая спрыту хопіць. У наш час, калі знаёміцца з супрацьлеглым полам стала модна з дапамогай інтэрнэту і СМІ, знайсці сабе жонку зусім проста. Вось і я вырашыў адшукаць каханую сучасным метадам.

Спачатку ўзяўся праглядаць аб’явы ў газетах і часопісах.

У адным выданні прачытаў: «Дзяўчына шукае кампаньёна для сумесных паходаў у кіно і прагулак». Чым не варыянт? Пра сур'ёзныя адносіны ні слова, а прагуляцца – справа няцяжкая. Набраў пазначаны нумар, дамовіўся пра сустрэчу.

Па дарозе ў кінатэатр новая знаёмая заўважыла:

– Мужчыны звычайна прыходзяць на спатканне з ружамі.

– Якія ружы? – пытаюся. – У аб'яве пра гэта нічога не было.

– А яшчэ перад кіно заходзяць са спадарожніцамі ў кафэ ці рэстаран, – працягвае, нібы не чуе мяне.

Я не вытрымаў:

– А жанчыны ў такіх выпадках грошай на аб'явы не шкадуюць. Свае пажаданні адразу на паперы выказваюць!..

У выніку паход у кіно не задаўся.

На старонках іншага выдання знайшоў аб'яву: «Зеленавокая прыгажуня з фігурай 90–60–90 жадае пазнаёміцца з багатым мужчынам». Чаму б і не? Мера матэрыяльных каштоўнасцей у кожнага свая. А мой унутраны свет – зусім не раскрытая скарбніца. Таму не раздумваючы тэлефаную і дамаўляюся пра спатканне.

Пры сустрэчы доўга гляджу ёй у вочы. Здаецца, сапраўды зялёныя. Потым дастаю з кішэні складны метр і пачынаю абмяраць яе стан.

– Як вам не сорамна! – крычыць дзяўчына.

– Выбачайце, вопыт вымушае. Жадаю ведаць дакладна, ці варта купляць ружы і ісці ў кафэ.

І сапраўды, падвох: замест пазначаных 90–60–90 атрымаліся ўсе 120–90–120.

– Мне вашы параметры таксама падабаюцца, – кажу ёй, – але ў аб’яве іншае было напісана…

Трэцяга спаткання зусім не адбылося, бо дзяўчына адразу сказала: «Згодная на ўсё. Хоць зараз пад вянец. Але спачатку – самы модны рэстаран, потым – Мальдзівы…»

– Выбачайце, памыліўся нумарам, – хутка пралапатаў я і адключыў тэлефон.

Пасля гэтага сам размясціў у газеце аб’яву: «Забяспечаны бізнесмен шукае сімпатычную дзяўчыну для сур’ёзных адносін». Вядома, наконт бізнесмена я зманіў, але чаго не зробіш дзеля таго, каб ажаніцца.

Пісьмы на электронную пошту пачалі прыходзіць адно за адным. Першае з іх гучала так: «Выйсці замуж за бізнесмена – мая мара». Думаю: «Ага, падстаўляй кішэнь!» Таму адказваю: «Прабачце, калі ласка, але памарце пра каго-небудзь іншага».

Другое было наступнага зместу: «Я звычайная сімпатычная дзяўчына, якая не мае грошай. Канечне, хочацца выйсці замуж па каханні. Але ад забяспечанага мужа не адмовілася б». Даю адказ: «Варта заўсёды верыць у цуды».

Трэцяе аказалася кароткім: «Не жадаеце быць маім забяспечаным зайчыкам?» Адказваю: «Згодны быць толькі львом. А капусту шукайце ў іншым месцы».

Пасля прагляду электроннай пошты зазірнуў у сацыяль-

ныя сеткі. На адной старонцы дзяўчына напісала так: «Жадаю мець побач моцнае мужчынскае плячо, у якога будзе дастаткова грошай на нашу будучую кватэру». На другой значылася: «Жадаю мець сапраўднага мужчыну, у якога ўсё ёсць». На трэцяй адразу папярэджвалі: «Хлопцам з перыферыі не адказваю».

Так у мае «сеткі» ніхто і не трапіў. Але вопыт з'явіўся.

На гэтым я вырашыў прыпыніць пошукі будучай жонкі. Мне ж толькі сорак гадоў, пачакаю яшчэ. Можа, якія іншыя – больш новыя – метады пошуку з'явяцца?..

## Як Вінцук «хваробы» пазбавіўся

Вінцук быў заўзятым футбольным балельшчыкам. Часам увесь дом чуў, як ён святкаваў гол. Да таго ж не абыходзілася без абавязковага атрыбуту – піва – і каментавання ходу матча.

Гэта не падабалася жонцы Аўдоцці, якой даводзілася самастойна займацца хатнімі справамі. Аднойчы яна не вытрымала і звярнулася да мужа з папрокам:

– Ты б хоць кран адрамантаваў! У мяне адной на ўсё рук не хапае.

Вінцук на імгненне адарваўся ад тэлевізара, зірнуў на жонку.

– А ты лічыш, што мне лёгка? Пасля футбола мне ні на што іншае моцы не хапае. Эмацыянальнае выгаранне асобы.

Чула пра такое? Вось што робіць са мной гэткая «хвароба».

– І яе не можа вылечыць ніводны ўрач? – не паверыла жонка.

– Не. Толькі цуд, – ціха адказаў мужчына.

Аўдоцця папрасіла мужа не хвалявацца, а лепей легчы ды адпачыць, а сама пайшла працаваць далей. Мужчына ж задаволена ўсміхнуўся і адправіўся выконваць пажаданне жонкі.

На наступны дзень пасля працы Вінцук па звычцы пачаў шукаць на кухні вячэру. Але яе не было. Ён зайшоў у залу. Там перад тэлевізарам на канапе сядзела Аўдоцця, глядзела серыял і лузгала семкі. Вінцук ад такога відовішча ажно прысвіснуў.

– Чаму не сустракаем любімага мужа?

Аўдоцця пусціла слязу і шэптам прамовіла:

– Захварэла я, Вінцук. Цяжкая хвароба мяне апанавала, ніякі ўрач не можа з ёю справіцца.

– Што яшчэ за хвароба? – занепакоіўся мужчына.

– Тэлесерыялізацыяй завецца. Пакуль не пагляджу вечарам усе серыі любімых кінастужак, за ніякую хатнюю работу рукі не бяруцца. Так што ты сам як-небудзь на кухні спраўляйся. Дый і мяне, хворую, частуй.

Незадаволены Вінцук пайшоў гатаваць вячэру. Тое ж яму давялося рабіць і на наступны дзень, і ў іншыя. Напрыканцы тыдня Вінцук звярнуўся да жонкі:

– Даражэнькая, мне б вопратку папрасаваць…

– Не ведаю, ці здолею, сёння самы пік хваробы настаў, –

стомлена адказала жонка.

Тут Вінцук не вытрымаў.

– Я не ведаю, што гэта за хвароба такая – «тэлесерыялізацыя», – але вылечыць яе змагу. Трэба выключыць тэлевізар і забыцца на яго існаванне!

– А ці не выявяцца нейкія пабочныя эфекты, калі мы тэлевізар вынесем на балкон? – здзівілася жонка.

– Не. Калі не глядзіш, то і не «хварэеш», – адказаў мужчына і пачаў адключаць тэлевізар.

– Колькі вольнага часу ў нас адразу з'явіцца… Тады, можа, кран адрамантуеш? – запыталася Аўдоцця.

– Канечне. Хіба я не гаспадар у хаце? – рашуча прамовіў Вінцук і пайшоў па інструменты.

Аўдоцця яшчэ з хвіліну пасядзела на канапе, а затым, напяваючы вясёлы матыў, адправілася на кухню. У душы яна была шчаслівая і ганарылася сабой: ніводны ўрач не мог вылечыць мужа, а яна за тыдзень ад жудаснай хваробы пазбавіла. Ці ж гэта не сапраўдны цуд?

# Не з той нагі
# Офісныя гісторыйкі

## Графін

Гэта гісторыя адбылася ў рэдакцыі адной гарадской газеты. Рэдактар там неяк сказаў свайму намесніку:

– А прынясі ты мне вады, Рыгор Данілавіч.

– Гэта мы зараз, Пятро Андрэевіч, – падхапіўся той.

І графін са стала ўзяў. Аднак, выйшаўшы з кабінета, падумаў: «А сакратарка ў нас на што?.. Я хоць і намеснік, але ж ваду гэтаму вепруку насіць не стану».

З гэтым ён паставіў графін на стол у прыёмнай. Сакратарка яго, вядома ж, убачыла. Падумала: «Ну добра, шэфу – то кавы, то гарбаты. А тут яшчэ і намесніку?.. Ды яму толькі моду пакажы… Не на тую напалі!»

Словам, абурылася кабета і занесла графін у аддзел палітыкі.

Супрацоўнікі яго таксама здзівіліся, бо сакратарка ж, як ты ні круці, ім не начальніца… Таму графін яны перадалі ў аддзел гарадскога жыцця.

Але хадзіць па ваду там таксама не пажадалі, і графін апынуўся ў аддзеле культуры.

– Мы, безумоўна, людзі інтэлігентныя, – адзначылі пра ся-

бе тамтэйшыя дзяўчаты, – але ж не настолькі…

У кабінеце вёрсткі ўсе шчыравалі над новым нумарам, таму графін аддалі прыбіральшчыцы, якая прыходзіла з заявай на адпачынак. «Гэтага мне яшчэ не хапала – ваду ім насіць», – пакрыўдзілася кабета і аднесла графін … назад у прыёмную.

Туды (і якраз жа ў гэтую хвіліну!) са свайго кабінета выйшаў рэдактар. Убачыўшы, што графін па-ранейшаму пусты, ён вырашыў, што намесніка некуды выклікалі, і пайшоў па ваду сам. А паколькі пачаўся абед, то сакратаркі на месцы не было, і куды знік графін, ніхто не ўбачыў…

Вярнуўшыся з абеда і згледзеўшы, што графіна з вадою няма, намеснік выклікаў да сябе сакратарку:

– Дзе графін? – спытаў у яе. – Шэф патрабуе.

Гэта крута мяняла справу, таму сакратарка ледзь не лёцьма кінулася ў аддзел палітыкі. Там, пачуўшы, што вада патрэбна рэдактару, а не ёй, сказалі: «Адну хвілінку», – і паімчаліся ў аддзел гарадскога жыцця, адтуль – у аддзел культуры…

Нарэшце высветлілі, што апошняй, хто бачыў прапажу, была прыбіральшчыца. Яе і папрасілі зайсці да намесніка, а ўжо разам з ім – у кабінет да шэфа.

Убачыўшы перад ім графін (ды яшчэ і паўнюткі!), намеснік зусім разгубіўся.

– Што вы хацелі, Рыгор Данілавіч? – спытаў у яго галоўны.

– Мы пад-думалі, – знячэўку стаў заікацца той, – можа,

вам генеральную прыборку варта было б зрабіць?..

– Згодзен, – сказаў шэф.

А вось што потым сказала прыбіральшчыца намесніку, не чуў ніхто.

## Не з той нагі

Раніцай да сябе выклікаў шэф.

– Вы ў Першамаі прыняць удзел жадаеце? – утаропіўшыся пагрозлівым позіркам, запытаўся ён.

Я задумаўся.

– Што вы стаіце, як укопаны? – запытаўся Іван Іванавіч зноў. – Дык так ці не?

Я сціснуў кулакі, сабраўся з духам.

«Усё ж, – думаю, – не кожны дзень тут пытаюцца тваёй думкі».

Але, як і заўжды, адкрыць рот не паспеў.

– І не думайце адмаўляцца! – пачуў я. – Усё проста: ад прадпрыемства – удзельнікі, удзельнікам – па заслугах.

– А за заслугі? – сарвалася неяк з языка.

– Усе людзі, як людзі! – абурыўся шэф. – Калі з'яўляюцца сюды, языкі ў іх адразу ж дзе патрэбна падвешваюцца. А ў вас, як бачу, ён свярбіць. Сваімі нетактоўнымі паводзінамі і некампетэнтнымі пытаннямі вы толькі ставіце палкі ў колы сабе і перашкаджаеце вырашаць праблемы простых рабочых мне.

– Выбачайце, – падціснуўшы хвост, вымавіў я, – перашкаджаць вырашэнню намеру не меў.

І задаў драпака з кабінета.

А ў абедзенны перапынак заглянуў у сталовую. Як высветлілася, не з той нагі сёння падняўся не толькі дырэктар, але і кухар.

– Вам што?

– Я, – кажу, – заказваў боршч, а мне падалі суп.

– Што заказвалі, тое і падалі, – адмахнуўся кухар. А потым дадаў: – Супу ў меню сёння няма.

– У меню, можа, і няма, – не разгубіўся я, – але ён яўна ёсць у маёй талерцы.

Кухара нібы муха ўкусіла.

– Бачыш, – кажа ён мне, – суп яму не боршч! А мне што, з-за гэтага апошнюю порцыю ўчарашняга супу ў памыі выліваць? Выручку губляць?

Пад такім ціскам адчуў сябе не ў сваёй талерцы. А кухар, заўважыўшы, што я разгубіўся, яшчэ вышэй узняў галаву.

– Усе людзі, як людзі, ядуць так, што аж за вушамі трашчыць! Звычайныя катлеты ідуць па кошце адбіўных, і не скардзіцца ніхто. А вы заварылі тут кашу. Сваімі недарэчнымі пытаннямі толькі апетыт наведвальнікам псуяце і ходу абслугоўвання працоўных мас замінаеце.

Ад такога нечаканага супадзення і здзіўлення ў мяне аж язык прыліп да нёба.

– Прабачце, – кажу, – абслугоўванню мас замінаць не ха-

цеў.

І даў лататы са сталовай.

Расчараваны такім няўдалым днём, зайшоў пасля працы ў краму, каб купіць малака. Ужо з якой нагі паднялася сёння прадаўшчыца, не ведаю, але яна ўбачыла, што я засяроджана разглядваю поліэтыленавы пакет, занепакоілася і насцярожана пацікавілася:

– Штосьці не так?

– Усё так, – адказваю, – тлустасць пазначана, завод-вытворца таксама. А вось тэрмін рэалізацыі знайсці ніяк не магу.

Прадаўшчыца занепакоілася яшчэ больш.

– А вы з санэпідстанцыі? – асцярожна і ласкава запыталася яна зноў.

– Не, звычайны спажывец.

– Ну і паводзьце сябе адпаведна, – параіла мне прадаўшчыца. – Няма чаго тут на пакет глядзець, усё адно, што бык на новае шула. І дадала: – Усе людзі, як людзі, бяруць і пытанняў не задаюць. Дый часу на гэта няма. Бывае, людзей у краме што селядцоў у бочцы. Якія тут пытанні? Тут сабе і абважыш, і рэшту недадасі. І ціха ўсё. А вы ўзнялі буру ў шклянцы вады. Цікавіць тэрмін рэалізацыі, дык і шліце лісты на пазначаны адрас. А некампетэнтнымі сваімі пытаннямі няма чаго тут прадстаўніка гандлю адрываць ад працы.

«Змовіліся яны сёння, ці што?»

– Выбачайце, – кажу, – адрываць прадстаўніка і ў думках

не было.

Я разлічыўся і мяне як ветрам з крамы садзьмула.

У расчараванні так у той вечар і заснуў.

А ўжо на наступны дзень, баючыся задаваць некампетэнтныя пытанні, я хутка разлічыўся ў краме і ўзяў у сталоўцы звычайныя катлеты па кошце адбіўных. Канечне, у краме крыху аблічылі і прадалі прадукт, тэрмін рэалізацыі якога даўно ўжо мінуў, а ў сталоўцы прыйшлося пераплаціць. Затое мне ветліва ўсміхнулася прадаўшчыца, а кухар, прыязна пахлопаўшы па плячы, пажадаў прыемнага апетыту.

Цяпер я мог смела ісці да шэфа: з якой бы нагі ён ні ўстаў, мае надзвычай тактоўныя паводзіны яму спадабаліся б.

## Шчаслівы дзень

Новы шэф быў злым як авадзень. Не паспеў я спазніцца на працу, як выклікаў да сябе.

«Ну, усё, – вырашыў я, – пэўна, звольніць сабраўся».

Нерашуча пераступіў парог кабінета і раптам пачуў:

– Вы, пэўна, стаміліся, дык сядайце, калі ласка. Я вас разумею: гэтыя трамваі, метро. Пакуль да працы дабярэшся, з ног зваlішся.

Я кінуў позірк на крэсла. У ім нікога не было.

«Хто ж гэта са мной размаўляе? – падумаў я. – Ці, можа, мне гэта ўсё толькі здалося?»

– Што ж вы стаіце? – пачуў я зноў. – Сядайце. А калі я

што не так сказаў, то прабачце, калі ласка.

Я няўпэўнена прысеў на першае крэсла, якое было бліжэй да выхаду, і ўрэшце ўбачыў шэфа. Ён стаяў спінай каля акна, трымаючы рукі ў кішэнях.

– Як вашыя справы? – пачуў я зноў лагодны голас.

«Ды гэта проста намеснік, таму і гаворыць так ветліва!» – падумаў я і няўпэўнена вымавіў:

# Конец ознакомительного фрагмента.

Текст предоставлен ООО «ЛитРес».

Прочитайте эту книгу целиком, купив полную легальную версию на ЛитРес.

Безопасно оплатить книгу можно банковской картой Visa, MasterCard, Maestro, со счета мобильного телефона, с платежного терминала, в салоне МТС или Связной, через PayPal, WebMoney, Яндекс.Деньги, QIWI Кошелек, бонусными картами или другим удобным Вам способом.